Сямейная газета

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца
з 9 жніўня 1917 г.

29 САКАВІКА 2018 г. ЧАЦВЕР № 60 (28676)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Гісторыі з шафы**



**Як нарадзіць лёгка?**



**Незвычайныя хобі мужчын**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Уладзімір ЗІНОЎСКІ, міністр эканомікі:**

*«Бізнес павінен стаць драйверам эканамічных працэсаў у краіне. Для гэтага трэба ўмацоўваць крэдыт даверу паміж дзяржавай і бізнесам. Адным з элементаў рэгулявання з'яўляецца стабільнае і простае падатковае заканадаўства. У сваю чаргу фіскальная палітыка павінна быць накіравана на эканамічнае развіццё, і ў яе аснове неабходна ствараць умовы для праяўлення прадпрымальніцкай ініцыятывы і раскрыцця патэнцыялу прадпрыемстваў усіх формаў уласнасці. Летась у краіне быў прыняты беспрэцэдэнтны пакет дакументаў, накіраваны на развіццё прадпрымальніцтва. У ім рэалізаваны адзін з ключавых падыходаў аб мінімальным умяшанні дзяржавы ў эканоміку суб'ектаў гаспадарання пры павышэнні асабістай адказнасці іх кіраўнікоў».*

ISSN 1990 - 763X

# Пад крэўскім ветрам



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Ландшафт старажытнай вёскі Крэва Смаргонскага раёна дапаўняюць сучасныя ветравыя энергаўстаноўкі. Адна з гэтых альтэрнатыўных крыніц энергіі знаходзіцца паблізу дарогі, якая вядзе ў суседні Маладзечанскі раён, да вёскі Лебедзева.**

■ Навацыі ў адукацыі

## КАГО ЗАЛІЧАЦЬ У ПРОФІЛЬНЫ КЛАС?

**Пастановай Міністэрства адукацыі ад 3 сакавіка 2018 года № 10 унесены змяненні і дапаўненні ў Палажэнне аб установе агульнай сярэдняй адукацыі.**

— Гэты дакумент прымаўся яшчэ ў 2011 годзе, таму была неабходнасць яго адкарэктаваць з улікам многіх новых абставін і прывесці ў адпаведнасць з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб прыёме ва ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі і навучанні ў іх», — растлумачыла **начальнік галоўнага ўпраўлення агульнай сярэдняй, дашкольнай і спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі Святлана УКЛЕЙКА.**

У прыватнасці, цяпер у палажэнні зафіксаваная магчымасць навучання ў класах з вывучэннем асобных вучэбных прадметаў на павышаным узроўні (раней у дакуменце гэтага пункта не было). Прычым такія класы ці групы могуць ствараць ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі не толькі на трэцяй, але і на другой ступені адукацыі. Для таго каб прэтэндаваць на залічэнне ў профільны клас на старшай ступені школы (10-11 класы), трэба мець сярэдні бал пасведчання аб агульнай базавай адукацыі не ніжэй за шэсць балаў, а па вучэбных прадметах, што будуць вывучацца на павышаным узроўні, не менш за сем балаў.

— Для старшай ступені школы нічога не змянілася — такія ж патрабаванні для залічэння ў класы з павышаным узроўнем вывучэння асобных прадметаў дзейнічалі і раней, — удакладніла Святлана Уклейка. — А на другой ступені навучання конкурсны адбор у класы, дзе пэўныя прадметы будуць вывучацца на павышаным узроўні, увогуле не прадугледжаны. Не будзе больш экзаменаў і ў пятыя класы гімназій.

СТАР. 3

## ЧАКАННЕ СЯЎБЫ

**Летась у гаспадарцы «Малінаўка-Агра», што ў Лоеўскім раёне, у сярэдзіне сакавіка з мехдвара стартавалі трактары. Сёлета на палях яшчэ ляжыць снег. Нават прагназаваць, калі глеба сагрэецца да неабходных +5 градусаў, ніхто не бярэцца. Толькі калі ўсталюецца цёплае надвор'е, можна будзе пачынаць сеяць. А пакуль уся тэхніка на лінейцы гатоўнасці.**



**Трактары ў КСУП «Малінаўка-Агра» на лінейцы гатоўнасці.**

Завяршаюцца работы ў майстэрнях сельгаспрадпрыемства «Малінаўка-Агра». Рыхтуецца да выхаду ў поле энерганасычаная тэхніка і кукурузныя сеялкі. Механізатар з 25-гадовым стажам Радзій Ібрагімаў рамантуе сеялку, а потым сядзе ў трактар, каб араць зямлю. Ён кажа, што ўжо вельмі хочацца змяніць замкнутае памяшканне майстэрні на неабсяжныя прасторы палёў:

— Канешне, усе ўжо вельмі чакаюць, калі ў поле выйдзе тэхніка.

Па ацэнцы гатоўнасці тэхнікі да пасяўной гаспадарка спрацавала няздрэнна — 98 % сельгасмашын падрыхтавана. Цалкам адрамантаваны пасяўныя і камбінаваныя глебаапрацоўчыя агрэгаты, дыскавыя бароны. Тэрміны для пасеву ранніх яравых культур — усяго 10—12 дзён. Карэктывы ў планы пасяўной можа ўнесці толькі надвор'е, гаворыць **дырэктар камунальнага сельскагаспадарчага ўнітарнага прадпрыемства «Малінаўка-Агра» Васіль ГЛЕЗАЎ:**

СТАР. 4